настольные игры, как «Го», «Сянци» (китайские шахматы), «Маджонг», «Стихи-цепочки», «Охота на тигра» (загадки), «Спрятать крючок», «Сбить бумажную открытку» и др. [7].

К началу XXI в. в содержании и формах детских игр произошли изменения. Традиционные игры китайских детей как способ управления собственным поведением, школа морали в действии, интенсивно насыщаются игровыми элементами как западных, так и восточно-азиатских стран. Игры, созданные китайским народом, быстро вытесняются современными компьютерными играми, производимыми китайскими и зарубежными транснациональными компаниями. Им и виртуальному общению дети уделяют все больше внимания. Из детского арсенала игр постепенно исчезают традиционные игры, остаются лишь примитивные догонялки, прятки и др. Особенно тревожной выглядит ситуация, касающаяся групповых подвижных игр. Содержание и формы игр значительно обеднели, игры все чаще сводятся к простому манипулированию игрушками, чему в немалой степени содействуют современные игрушки – куклы типа Барби, Человек-паук, маленькие копии предметов бытовой техники, оружия и т. д. Технически оснащенная игрушка выступает не средством игры, связанным с разнообразными действиями и переживаниями ребенка, а самодостаточной вещью, не оставляющей простора для творчества и активности детей. Тогда как основная сильная сторона сюжетной игрушки состоит в условности ею изображаемого. Детали восполняются воображением ребенка. Традиционная игрушка будила детскую фантазию, формировала детскую игру.

С появлением интернет-технологий началось массовое увлечение субъектов детской субкультуры компьютерными играми, которые заметно вытесняют традиционные игры. Широкое распространение в детской среде компьютерных игр послужило основой для возникновения особой детской субкультуры геймеров, имеющей множество ответвлений.

**Список литературы:**


1. Зеньковский, В. Психология детства / В. Зеньковский. – М. : ИЦ «Академия», 1995. – 265 с.
2. Спенсер, Г. Воспитание: умственное, нравственное и физическое / Г. Спенсер / сост. вступ. ст. Г. Корнетова; пер. с англ. М. Лазеревой. – М. : РАО, 2002. – 288 с.
3. [荷兰]约翰·赫伊津哈《游戏的人》，北京：中国美术学院出版社，1998 年，322 页 = [Нидерланды] Джон, Хейзинья. Человек играющий / Хейзинья Джон. – Пекин: Издательство Китайской Академии Художеств, 1998. – 322 с.
4. Шиллер, И. К. Ф. Письма об эстетическом воспитании / И. К. Ф. Шиллер. – М. : Рипол Классик, 2018. – 242 с.
5. 易杏英《儿童游戏大全（续）——外国、港台儿童游戏精选》，北京，中国广播电视出版社，1993，396 页 = И, Синъин. Энциклопедия детских игр (продолжение) – Избранные игры для детей из зарубежных стран, Гонконга и Тайваня / Синъин И. – Пекин : Китайское издательство радио и телевидения, 1993. – 396 с.
6. 蔡丰明《游戏史》，上海，上海文艺出版社，1997 年，239 页 = Цай, Фэнмин. История игр / Фэнмин Цай. – Шанхай : Шанхайское издательство литературы и искусства, 1997. – С. 239.
7. 石民勇《游戏概论》，北京，中国传媒大学出版社，2009，5 页 = Ши, Миньен. Введение в игры / Миньен Ши. – Пекин : Издательство Китайского Университета Медиа, 2009. – 5 с.



***Наталля Лінькова***


## СЕРЫЯ ПАМЯТНЫХ МАНЕТ «СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ» НАЦЫЯНАЛЬНАГА БАНКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ


*Артыкул прысвечаны серыі памятных манет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь «Слуцкія паясы», якая вобразна распавядае пра ўнікальную з'яву нацыянальнай культурнай спадчыны Беларусі.*



***Natalia Linkova***


## SERIES OF MEMORIAL COINS «SLUTS BELTS» OF THE NATIONAL BANK OF THE REPUBLIC OF BELARUS


*The article is dedicated to a series of commemorative coins of the National Bank of the Republic of Belarus «Slutsk Belts», which figuratively tells about the unique appearance of the national cultural heritage of Belarus.*


Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1996 г., няспынна выпускае ў зварот памятныя манеты, прысвечаныя гісторыі і культуры Беларусі. Сярод іх важна вылучыць серыю памятных манет «Слуцкія паясы» («Слуцкие пояса»), якая адлюстроўвае гісторыю вырабаў ткацкай мануфактуры Радзівілаў, што працавала ў Слуцку ў XVIII–першай палавіне XIX ст. Серыя складаецца з пяці манет: «Слуцкія паясы. Меткі», «Слуцкія паясы. Калекцыянаванне», «Слуцкія паясы. Касцюм шляхціца», «Слуцкія паясы. Радзівілы», «Слуцкія паясы. Ткацтва».

Адзначым, што менавіта слуцкія паясы для Беларусі з'яўляюцца важным здабыткам мастацкай спадчыны і сусветна прызнаным дасягненнем нацыянальнай культуры. Іх адносяць да твораў народнага ткацтва, разглядаючы як элітарныя прыклады раскошы арыстакратыі. Шырокія тканыя паясы з прыгожымі ўзорамі атрымалі шырокую распаўсюджанасць на беларускіх землях яшчэ ў XVI–XVII стст. (першапачаткова іх прывозілі з усходніх краін). Паясы служылі ў святочным строі заможнага насельніцтва абавязковым элементам, які амаль нязменна прысутнічаў у мужчынскім адзенні на працягу некалькіх стагоддзяў. Тлумачэнне гэтай традыцыі, як і феномену папулярнасці ўсходніх паясоў, трэба шукаць у характары жыцця грамадства, ментальнасці яго тагачаснай эліты [3, с. 7]. Паступова на беларускіх землях сфарміравалася ўнікальная мастацкая з'ява – «слуцкі пояс».

Наш час прынёс новае стаўленне да слуцкіх паясоў: страціўшы значэнне побытавай рэчы і важнага элемента арыстакратычнага касцюма, яны набылі статус помніка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, нацыянальнага сімвала, «візітнай карткі» Рэспублікі Беларусь.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, тое, што ў свет у 2013 г. выйшла серыя памятных манет «Слуцкія паясы» – гэта вынік Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гг., прынятай беларускім урадам. Такім чынам, на дзяржаўным узроўні вырашылі выкарыстаць асветніцкі і рэпрэзентацыйны патэнцыял слуцкіх паясоў. Падкрэслім, што памятныя манеты выконваюць шмат функцый, у тым ліку могуць быць добрым сувенірам, калекцыйным рарытэтам, які падкрэсліць імідж нашай краіны ў свеце. Дызайн ўсёй серыі манет «Слуцкія паясы» належыць беларускаму аўтару С. Някрасавай. Манеты былі адчаканены на ЗАТ «Літоўскі манетны двор» (Вільня, Літва).



Малюнак 1 – Аверс і рэверс памятнай манеты «Слуцкія паясы. Меткі» наміналам 20 бел. руб.



Малюнак 2 – Аверс і рэверс памятнай манеты «Слуцкія паясы. Меткі» наміналам 1 бел. руб.



Мал. 3 – Аверс і рэверс манеты «Слуцкія паясы. Калекцыянаванне»

Першыя памятныя манеты серыі «Слуцкія паясы. Меткі» наміналам у 20 і 1 рубель (сярэбраная і медна-нікелеівая) выйшлі ў зварот 21.11.2013 г. (мал. 1–2). Разгледзім іх аверс: уверсе размясцілася рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь (яна прысутнічае на манетах усёй серыі); у цэнтры манеты ў крузе – выява фрагмента двухбаковага пояса, вырабленага на Слуцкай мануфактуры (1760/1762 – 1776), які зараз захоўваецца ў калекцыі Мінскага абласнога краязнаўчага музея [1]. Важна адзначыць, што на сярэбранай манеце наміналам у 20 рублёў фрагмент пояса выкананы метадам тампадруку, дзякуючы гэтаму малюнак адтрымліваецца рознакаляровым – такім спосабам аўтар дызайну манет падкрэсліў прыгажосць і непаўторнасць матываў слуцкага пояса (метад тампадруку выкарыстоўваецца ў мастацкім афармленні ўсіх сярэбраных манет серыі). На ўсіх манетах серыі па вонкавым коле ўверсе размешчаны надпіс: Рэспубліка Беларусь; злева – год чаканкі, справа – проба сплаву (на сярэбранай манеце) і мастацкі элемент (на медна-нікелевай), унізе – намінал (на сярэбранай – 20 рублёў, на медна-нікелевай – 1 рубель).



Мал. 4 – Аверс і рэверс манеты «Слуцкія паясы. Шляхецкі касцюм»



Мал. 5 – Аверс і рэверс манеты «Слуцкія паясы. Радзівілы» наміналам 20 бел. руб.



Мал. 6 – Аверс і рэверс манеты «Слуцкія паясы. Ткацтва» наміналам 20 бел. руб.

На адваротным баку манет (рэверсе) злева па крузе змешчаны надпіс: Слуцкія паясы. Меткі; у цэнтры манеты размясцілася шрыфтавая кампазіцыя на аснове тканых метак слуцкіх паясоў і стылізаванага фрагмента карты горада Слуцка XVII–пач. XVIII ст., якія адлюстроўваюць час, месца і аўтарства іх стваральнікаў, і надпісы: SLUCK, MEFECIT/SLUCIAE., IOANNES.MADZARSKI, ВЫГРДЪ /СЛУЦКЪ // ЛЕО МА/ЖАРСКІ [2].

Памятные манеты «Слуцкія паясы. Калекцыянаванне» наміналам у 20 і 1 рубель з'явіліся ў звароце 21.11.2013 г. На аверсе манет у крузе па цэнтры змешчана выява фрагмента двухбаковага пояса, вырабленага на Слуцкай мануфактуры, які захоўваецца ў калекцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (мал. 3). На адваротным баку злева па крузе змешчаны надпіс: Слуцкія паясы. Калекцыянаванне; у цэнтры – выява вокладкі каталога выставы слуцкіх паясоў 1927 г. і фрагмента пояса з калекцыі І. Луцкевіча – вядомага гісторыка і этнографа.

Памятныя манеты «Слуцкія паясы. Шляхецкі касцюм» наміналам у 20 і 1 рубель былі ўведзены ў зварот 20.12.2013 г. У цэнтры аверса манет ў крузе выява фрагмента аднабаковага пояса, вырабленага на Слуцкай мануфактуры (1776–1780), які знаходзіцца ў калекцыі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (мал. 4). На адваротным баку манет па крузе размешчана назва манеты і выява фігуры шляхціца ў традыцыйным касцюме, справа – стылізаваная выява яго генеалагічнага дрэва як знака шляхецкага роду [2].

Памятные манеты «Слуцкія паясы. Радзівілы» уведзены ў зварот 20.12.2013 г. У цэнтры аверса манет ў крузе – выява фрагмента аднабаковага літога пояса, вырабленага на Слуцкай мануфактуры (1780–1807), які зараз знаходзіцца ў калекцыі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (мал. 5). На рэверсе – злева па крузе змешчаны надпіс: Слуцкія паясы. Радзівілы; справа – выява фігуры князя Міхаіла Казіміра Радзівіла; злева – дэкаратыўная кампазіцыя на аснове яго родавога герба і малюнак Слуцкай брамы ў горадзе Нясвіжы (як элемента архітэктурнага ансамбля рэзідэнцыі Радзівілаў) і задрапаваны слуцкі пояс [2].

Памятные манеты «Слуцкія паясы. Ткацтва» уведзены ў зварот 20.12.2013 г. На аверсе манет па цэнтры ў крузе – выява фрагмента двухбаковага чатырохліцавога пояса, вырабленага на Слуцкай мануфактуры (1760/1762–1776) з калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры. Разгледзім рэверс манет: злева – выява фігуры купца, сімвалізуючая гандлёвыя сувязі горада Слуцка, справа – дэкаратыўная кампазіцыя, якая складаецца з герба горада Слуцка, ткача за станком, на якім выраблялі традыцыйныя тканыя паясы, і выявы горада (як знак цэнтра развітой мануфактурнай вытворчасці).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Такім чынам, памятныя манеты серыі «Слуцкія паясы» Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у яркай вобразнай форме расказваюць аб гісторыі культуры Беларусі, ролі слуцкіх паясоў ў развіцці не толькі беларускага, але і агульнаеўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Адзначым, што і самі па сабе памятныя манеты ўспрымаюцца як творы мастацтва, выконваючы сваю эстэтычную і мемарыяльную функцыю.

**Спіс літаратуры:**


1. Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь. Общие сведения // Nbrb.by [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.nbrb.by/CoinsBanknotes. – Дата доступа : 20.03.2020.
2. Каталог памятных монет, выпущенных в обращение Национальным банком Республики Беларусь // Nbrb.by [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.nbrb.by/CoinsBanknotes/Coins/Commemorative/ Catalog. – Дата доступа : 10.03.2020.
3. Лазука, Б. Слуцкія паясы : адраджэнне традыцый / Б. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2013 – 127 с.



***Чжао Мэнсинь***


## ОРНАМЕНТ В ТЕАТРАЛЬНОМ КОСТЮМЕ КИТАЯ: К ПРОБЛЕМЕ ОПРЕДЕЛЕНИЯ ХУДОЖЕСТВЕННЫХ ОСОБЕННОСТЕЙ


***Zhao Mengxin***


## ORNAMENT IN THEATRICAL COSTUME OF CHINA: TO THE PROBLEM OF DETERMINING ARTISTIC FEATURES


*Актуальность статьи обусловлена широким применением орнамента в художественной практике театрального костюма. Своеобразие композиций, их связь с основами мировоззрения народа делают орнамент важным атрибутом в процессе усвоения культурно-исторического наследия Китая.*

*The relevance of the article is due to the widespread use of ornament in the artistic practice of theatrical costume. The originality of the compositions, their connection with the foundations of the worldview of the people make the ornament an important attribute in the process of assimilation of the cultural and historical heritage of China.*


Китайский театральный костюм представляет собой уникальное явление декоративно-прикладного искусства. Социально-иерархическая детерминированность костюма, его композиционные принципы, а также своеобразие колористического строя и орнамента определили характер развития, использования и декорирования всего комплекса театрального костюма. Орнамент театрального костюма неотделим от образцов повседневной одежды, тем не менее, он видоизменяется вслед за развитием театра и не может быть ограничен типичными композициями в декоре одежды и аксессуаров. Элементы орнаментальной композиции театрального костюма отличаются многообразием и характеризуются целостностью в отражении основ национального искусства.

Китайский театр берет начало в древних танцах, связанных с жертвоприношениями. Костюм для ритуального танца разнообразно декорировали цветами, мехом животных, яшмовыми подвесками [4, с. 4]. Впоследствии украшения видоизменялись, а их декор усложнялся. В период правления императора Яо Шунь второго (эпоха Яо Шунь (ок. 2187–2067 гг. до н.э.) костюм стали украшать 12 видов орнамента: солнце (жи), луна (юе), звезды (син), горы (шань), дракон (лун), фазан (хуа чун), ритуальная утварь (и), водоросли (цзао), огонь (хо), вышивка с изображением рисовых зерен (фэнь ми), вышивка с чередующимся сине-зеленым орнаментом (фу) и черно-белым топором (фу) [3, с. 68]. Во время династии Чжоу (1046–256 гг. до н.э.) установлен закон о том, что солнце, луну и звезды можно вышивать только на флагах, оставшиеся девять – только на одежде, к тому же дракон должен возглавлять их.

Во время расцвета китайской культуры в эпоху Тан (618–907), в эпоху династий Сун и Юань (960–1368) драматическое искусство достигло высокого уровня, что стимулировало мастерство театрального костюма. Орнаментальная образная система как таковая получила свое развитие в процессе предметно-творческой деятельности человека в эпоху неолита. Своего же пика она достигла только во времена правления двух последних династий – Мин и Цин (1368–1911). Это была благопожелательная образная орнаментальная система, нашедшая отражение в декоре театрального костюма. Для передачи смысла орнамента использовались различные приемы: аллегории, графические эмблемы, символы, иероглифы и т. д. [4, с. 6]. Смысловая наполненность и разнообразие форм китайского орнамента поражают. В то же время присутствует стилевое единство орнаментальных композиций, внимание к красоте формы и смысловому содержанию.

В эпоху Мин отличительным знаком должностного лица являлась квадратная ткань на длинном халате. На ней был особый орнамент, в виде птицы, животного и т.п., символизирующего собой положение чиновника. Например, журавль небожителя (в китайской мифологии небожитель едет верхом и кормит журавля), золотистый фазан, павлин, ласточка и т. п. обозначают определенный уровень социальной культуры; полководцы и генералы разграничивали свой статус благодаря изображению на одежде единорога, льва, леопарда и тигра. Этот орнамент на одежде чиновников стал широко использоваться в декоре театрального костюма.

Повседневная одежда отличается большим разнообразием орнаментальных композиций и их классификация более детальная (узоры с изображением небесных явлений, геометрические и растительные узоры, с животной тематикой). В театральном костюме классификация достаточно обобщенная. Например, на одежде персонажей Пекинской оперы журавль небожителя – символ верности, преданности и долголетия; сливовое дерево, орхидея, бамбук, хризантема и т.п. (образы гражданских чиновников) – символ счастья и исполнения желаний [2, с. 215]. Фазан, ласточка и прочие птицы, как правило, не используются; леопард и другие животные встречаются в декоре театрального костюма редко (лев представлен на костюмах военачальников); единорог, наоборот, часто присутствует как в костюме влиятельных сановников, так и полководцев [2, с. 123].

В Китае с древних времен популярны легенды о драконе и фениксе – предвестниках радостных событий. Во всех легендах это воображаемые живые существа. Орнамент «дракон и феникс приносят удачу» или «дракон летит, феникс танцует» – символ почтения, счастья, поэтому он обычно декорировал одежду уважаемых людей. Или, например, пожелание «Пусть полное счастье обеспечит вам долголетие» (у фу пэн шоу), в слове со значением «летучая мышь» произношение иероглифа «фу» одинаковое с иероглифом «фу» в слове со значением «счастье», поэтому пять летучих мышей, окружающих иероглиф долголетия или персика, передают благожелательный смысл (удачливый, спокойный, счастливый, здоровый).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ